УДК 81’373.21 (476.7)

А.А. Босак, канд. філ. навук, дац. (БДЭУ, Мінск);
В.М. Босак, д-р с.-г. навук, праф. (БДТУ, Мінск)

АСАБЛІВАСЦІ НАЗВАЎ АДЗЕННЯ Ў ГАВОРКАХ ВЕРХНЯГА НАД’ЯСЕЛЬДЗЯ

Пры вывучэнні лексічных асаблівасцей гаворак Верхняга Над’ясельдзя назвам адзення, яго часткам і рабоце з ім прысвечана дзесяць тэматычных груп: ‘пінжак’, ‘асенняе паліто’, ‘штаны’, ‘манжэты’, ‘падол’, ‘скураны пасак’, ‘пасак з тканіны’, ‘рамантаваць адзенне’, ‘рамантаваць шкарпэткі’, ‘мыць бялізну’.

Для назвы ‘пінжака’ ў гаворках Верхняга Над’ясельдзя ўжываюцца лексічныя і фанетычныя варыянты: *каптáн, пінжáк /пі^{ы}нжáк/*, *кýрцік*. Для абазначэння ‘асенняга паліто’ ва ўсіх абследаваных пунктах зафіксавана лексема *ясёнка* з фанетычнымі варыянтамі *ісёнка* і *осы^{і}нка* на паўднёвым захадзе рэгіёна. Для абазначэння ‘штаноў’ існуюць фанетычныя варыянты: *нагавíцы /нагавыці^{ы}, нагавы^{і}цы, нагавыці/*, *ганавíцы /ганавы^{і}цы, ганавы^{і}ці^{ы}, ганавыці^{ы}/*. Для назвы ‘манжэт’ ужываюцца лексічныя, словаўтваральныя і фанетычныя варыянты: *апусцэ /опусцэ, запусцэ/*, *абшэўкі /абшыўкі, ашэўкі, обшэвкі^{ы}/*, *комні^{ы}рцы /кумні^{ы}рцы, пудкумні^{ы}рцы/*, *абшлáгі*, *манкéты /манжэты/*, *чохлы*, *рубі^{ы}жы*. Для назвы ‘падолу’ ўжываюцца фанетычныя, лексічныя і словаўтваральныя варыянты: *пéлена /пэлена, пылена, пáлена, пéляна, пéлян, пéлен/*, *падóлак /подóлок, подóл/*, *запýл /запíл/*, *прыпóл*. Для абазначэння ‘скуранога паска’ існуюць фанетычныя, словаўтваральныя і лексічныя варыянты: *шыць /шыцік, шытык/*, *папрýга /попрýга, папрýжка/*, *пáсок*. Для назвы ‘паска з тканіны’ ўжываюцца лексічныя, словаўтваральныя і фанетычныя варыянты: *пóразок /пýразок, пóрозок, пóўразок, пóўрозок, пáўразак, пóразоўка/*, *праўзýк /проўзýк, праўзáк, провзýк, прузýк, прузáк/*, *матýз /матузóк/*, *зáвязка /зáв’язка/*, *паясóк /пóяс/*, *кíчка*.

Словазлучэнне ‘рамантаваць адзенне’ перадаецца наступнымі варыянтамі: *лáніць /лáніці, лáні^{ы}ты/*, *латáць /латáці, латáты/*, *стрóіць*, *прáвіць*. Словазлучэнне ‘рамантаваць шкарпэткі’ перадаецца шэрагам фанетычных варыянтаў, а таксама лексічнымі варыянтамі: *цыравáць /цыравáці*, *цыровáці*, *цуравáці*, *цуровáці*, *цэровáці*, *цыровáты*, *цуровáты*, *цюровáты/*, *зарабляці*, *штóпаты*, *зашывáты*. Словазлучэнне ‘мыць бялізну’ перадаецца фанетычнымі і лексічнымі варыянтамі: *мыць /мыці*, *мыты/*, *аджымáць*, *кýтаці*, *белíці /бэлíці*, *бэлíты*, *бэлíтыс*, *бэлíтысь*, *бэлíтыся/*.